Матывы старога запавету ў паштовых марках

Аўтар: Лявон Карповіч
03.04.2022 00:00



Кніга Быцця – першая кніга Біблii – пачынаецца аповедам пра стварэнне свету. Апісанне гэтага працэсу ў Старым Запавеце настолькі пераканаўчае і прыгожае, што стала натхненнем для многіх аўтараў мастацкіх твораў. Пасля іх працы знайшлі адлюстраванне ў марках, сярод якіх, як вядома, сустракаюцца настолькі цікавыя і каштоўныя экземпляры, што яны атрымліваюць сваё месца ў калекцыях філатэлістаў за грошы не меншыя, чым кошт саміх шэдэўраў сусветнага мастацтва. Напрыклад, на блоку, выдадзеным поштай Іспаніі ў 1980 годзе, змешчана рэпрадукцыя знакамітага “Габелена Стварэння” XI стагоддзя. Гэта незвычайна каштоўны і прыгожы твор мастацтва, які захоўваецца ў катэдры іспанскага горада Верона. Узор у выглядзе круга паказвае розныя сцэны стварэння свету і чалавека. Змяшчае таксама цытаты на лацінскай мове з Кнігі Быцця. Круг у сярэдзіне мае выяву Бога Стварыцеля. Вакол яго надпіс: “І сказаў Бог: хай будзе святло. І сталася святло” (Быц 1, 3). Над цэнтральным кругам (на 11 гадзін) самы цёмны сектар прысвечаны “цемры над бездань” перад пачаткам Стварэння. Наступны сектар (на 12 гадзін) адслюстроўвае Дух Божы над водамі. Справа ад яго – стварэнне свету. Сіметрычныя сектары па “экватары”: “хай будзе цвердзь” і “аддзяліў ваду”. Самы вялікі ніжні сектар – стварэнне істот водных і птушак. Па баках ад яго – стварэнне жывёл ды чалавека і стварэнне жанчыны. Аўтары “Габелена” выказалі не толькі захапленне справай стварэння свету, але і падкрэслілі яе гармонію. Дзякуючы пошце “Габелен

Стварэння” стаў больш вядомым, выклікаючы пачуццё ўсведамлення велічы падзеі.


Аўтар: Лявон Карповіч
03.04.2022 00:00



[illegible]ак

Аўтар: Лявон Карповіч
03.04.2022 00:00





” і